Download



Вясна: Палітвязні Беларусі

З палітвязняў спагналі грошы за пашкоджаныя смеццевыя кантэйнеры 10 і 11 жніўня 2020 года

У судзе Заводскага раёна 19 кастрычніка разглядзелі грамадзянскі пазоў «Спецкамунаўтатранса» да палітзняволеных **Аляксея Мельнікава** і **Ігара Рудчыка**, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях за ўдзел у масавых беспарадках. Інтарэсы прадпрыемства на судзе прадстаўляла юрыстка **Святлана Цярэшка**. Справу разглядала суддзя **Марына Саўчук** з удзелам пракурора **Міхаіла Гаўрылава**.

Згодна з матэрыяламі справы, **Мельнікаў** і **Рудчык** у ноч з 10 на 11 жніўня 2020 года каля «Рыгі» выкарыстоўвалі смеццевыя кантэйнеры ў якасці барыкад на праезнай частцы. «Спецкамунаўтатранс» прадаставіў суду дакументы, якія пацвярджваюць, што кантэйнеры былі паламаныя ад дзеянняў пратэстоўцаў. Па ацэнцы экспертаў пашкоджанні былі сур'ёзныя, таму далей выкарыстоўваць кантэйнеры па назначэнні было немагчыма. Сума стратаў, якую прадпрыемства патрабавала спагнаць з адказнікаў — **2 736 рублёў 52 капейкі**. Але першапачаткова сума была **3 081 рублёў 60 капеек**. Яе скарацілі, бо сваякі Мельнікава сплацілі прадпрыемству суму **за адзін пашкоджаны кантэйнер** у памеры **345 рублёў 8 капеек.**

У выніку, суддзя **Саўчук** задаволіла пазоў «Спецкамунаўтатранса» і пастанавіла спагнаць салідарна з **Аляксея Мельнікава** і **Ігара Рудчыка** за пашкоджаныя кантэйнеры **2 736 рублёў 52 капейкі**. Акрамя гэтага палітвязні павінны выплаціць дзяржпошліну ў памеры **135 рублёў 82 капеек.**

t.me/prisoners_spring96/388

466 viewsOct 21, 2021 at 11:51

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy